Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня
штодзенная газэта

СЕРАДА
18 СТУДЗЕНЯ 1933 г.
№ 15 (3671)

ПЛЕНУМ ГК І ГКК КП(б)Б

20 студзеня 1933 г. а 7 гадзіне ўвечы ры ў памяшканьні Яўдзяржтэатру (былы дом Культуры) СКЛІКАЕЦЦА АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ і ГКК КП(б)Б сумесна з гарадзкім і гарнізонным партактывам.

Абвестка дню:

1. Вынікі студзеньска а пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) дакл. тав. ГІКАЛО.

Члены ЦК, ЦКК, Менгаркому і ГКК КП(б)Б і члены рэўкамісіі ЦК і ГК праходзяць па сваіх мандатах. Для актыву білеты будуць выданы сакратаром па тканектываў і ячэек у гаркоме 19 студзеня г. г.

Менгарком КП(б)Б

„...РЭВАЛЮЦЫІНАЯ ПІЛЬНАСЬЦЬ і ГАТОЎНАСЬЦЬ ЗРУЙНАВАЦЬ КЛЯСАВАГА ВОРАГА ПАВІННЫ З ЯЎЛЯЦЦА АСНОЎНАЙ ЗАПАВЕДЗЬДЗЮ КАМУНІСТА і ГАЛОЎНАЙ ПРАДПАСЫЛКАЙ ДАЛЕЙШАГА ПРАСОЎВАНЬНЯ НАПЕРАД"

(З рэзалюцыі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 10 студзеня г. г.)

Загатаўляць лён высокай якасьці

Па ўсіх відах загатовак—лёназагатоўкі застаюцца самым адстаючым участкам. На гэтым вучастку ўпартай клясавай барацьбы, мы яшчэ не дамагліся канчатковай перамогі над клясавым ворагам.

На 16 студзеня БССР выканала толькі 77,4 проц. гадавога пляну лёназагатовак. Прычым тэмпы прыросту за апошнія дні яўна ганебныя, а гэта гаворыць аб тым, што на мясцох маюць месца дэмабілізацыйныя настроі, што ў радзе раёнаў не прынялі ўсіх мер для таго, каб зламаць кулацкі сабатаж, а проста аслабілі сваю ўвагу да выкананьня загатоўчых плянаў.

Посьпех выкананьня рэспубліканскага пляну ў першую чаргу вырашаюць лёнаводныя раёны, бо іх удзельная вага ў рэспубліканскім пляне роўна 75 проц. На партарганізацыі, саветы лёнаводных раёнаў, як вядучых па загатоўках тэхкультур, у першую чаргу кладзецца адказнасьць за рэспубліканскі плян. Яны павінны былі ў першую чаргу паказаць сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай барацьбы за лён, уменьне арганізаваць масы калгаснікаў і вясковы актыў на тое, каб зламаць кулацкі сабатаж, каб забясьпечыць сыравінай нашу сацыялістычную прамысловасьць.

А аб чым-жа гавораць лічбы? Лічбы паказваюць, што большасьць лёнаводных раёнаў усё яшчэ ганебна зрываюць загатоўкі. Калі Лёзьненскі, Крупскі, Лепельскі і Бялыніцкі раёны з лёнаводных раёнаў, Жыткавіцкі, Ельскі, Крычаўскі, Тураўскі і Чачэрскі з нялёнаводных раёнаў выканалі свае пляны ад 85 да 105 проц., дык такія раёны, як Мсьціслаўскі, Асьвейскі, Полацкі, Сеньненскі, Лоеўскі, Веткаўскі і Бягомльскі даюць выкананьне пляну ад 40 да 70 проц.

Ці могуць гэтыя раёны, якія ганебна зрываюць выкананьне рэспубліканскага пляну, тлумачыць гэтае агіднае становішча якімі-небудзь аб'ектыўнымі ўмовамі? Бязумоўна не.

Факты з месц гавораць, што прычыны не ў аб'ектыўных умовах, не ў адсутнасьці лёну, як гэта спрабуюць даводзіць апартуністы з асобных раёнаў. Справа ў няўменьні цэлага раду нашых таварышоў на мясцох перабудаваць фронт барацьбы з кулацтвам, у неразуменьні таго, што твар клясавага ворага зьмяніўся за апошні час, зьмянілася тактыка клясавага ворага ў вёсцы і што адпаведна з гэтым трэба зьмяніць сваю тактыку, каб дабіцца посьпеху. Ворат зразумеў абстаноўку, якая зьмянілася, зразумеў сілу і магутнасьць новага ладу ў вёсцы і, зразумела, перабудаваўся, зьмяніў сваю тактыку, перайшоў ад простай атакі супроць калгасаў да работы ціхай сапай» (СТАЛІН).

Рад карэспандэнцый з раёнаў поўнасьцю пацьвярджае бліскучы ленінскі аналіз слабага ходу загатовак, даны правадыром партыі тав. СТАЛІНЫМ.

Сёньня мы друкуем карэспандэнцыю з Мышынвіцкага сельсавету, Сіроцінскага раёну, у якой гаворыцца, як клясавы вораг у асобе чарскага пралез у камуну на пасаду брыгадзіра і пастараўся выкарыстаць сваю пасаду для таго, каб сарваць выкананьне пляну лёназагатовак камунай. Для гэтага ён распарадзіўся, каб трасту падсьцілалі жывёле, накрывалі ёю стрэхі, гародніну, абы ня злаць лён дзяржаве. А побач партячэйка займаецца разваньнямі аб адсутнасьці лёну,—імкнецца давесьці нерэальнасьць плянаў.

Гэты факт і яшчэ сотні іншых, якіх мы шмат падаем на старонках нашай газэты, ёсьць бліскучае пацьверджаньне сказанага тав. СТАЛІНЫМ, што «калгасы, як сацыялістычная форма арганізацыі гаспадаркі, могуць паказаць цуды гаспадарчага будаўніцтва, калі на чале іх стаяць сапраўдныя рэвалюцыянэры бальшавікі камуністы. І наадварот, калгасы могуць ператварыцца на пэўны перыяд у прыкрыцьцё ўсякага роду контррэвалюцыйных дзеяньняў, калі ў калгасах будуць запраўляць эсэры і меншавікі, пятлюраўскія афіцэры і іншыя белагвардзейцы, былыя дзянікінцы і калчакоўцы... што калгасы, як форма арганізацыі, ня толькі не гарантаваны ад пралязьньня антысавецкіх элемэнтаў, але прадстаўляюць нават на першы час некаторую зручнасьць для часовага выкарыстаньня іх контррэвалюцыянэрамі» (СТАЛІН).

Іменна гэтага не разумеюць у шмат лікіх партячэйках. Буржуазныя перараджэнцы з партбілетамі ў кішэнях, якія часта аказваюцца на чале асобных партячэек, сельсаветаў, у загатоўчым апараце ня толькі ня прымаюць мер, каб выкрыць кулацкія махінацыі і выкінуць кулакоў з калгасаў, а сам кнуўшыся з кулакамі, здрадзіўшы пар ты яны сваёй партыйнасьцю прыкрываюць іх дзейнасьць, дапамагаюць ім у іх контррэвалюцыйнай рабоце. Толькі гэтым тлумачыцца агіднейшы ход выкананьня плянаў па цьвёрдых заданьнях і цацканьне з кулаком у радзе раёнаў, гэтым тлумачыцца тое, што кулацкім і шкодніцкім элемэнтам удаецца беспакарана на працягу доўгага часу арганізоўваць сабатаж загатовак, як у калгасах, так і ў адноасобным сэктары.

Асабліва трэба падкрэсьліць пытань не якасьці тэхкультур, бо ў гэтых адносінах мы маем яўна пагражаючае становішча. У пытаньнях якасьці так сама яскрава праяўляецца кулацкае супраціўленьне лёназагатоўкам. Іменна пад уплывам варожых элемэнтаў рад калгасаў лепшы лён разьмяркоўвае унутры калгасаў, пад іх уплывам арганізуецца раскраданьне лепшага лёну, а часта яго проста гноясь, а на загатоўчыя пункты вязуць лён самай горшай якасьці, на лёназаводы вязуць гнілую трасту, а райканторы Заготлёну прымаюць без разбору: «абы выканаць плян». Адсутнасьць барацьбы за якасьць валакна і трасты прывяла да таго, што прышлося перагледзець процант выкананьня пляну асобнымі раёнамі, прагледзець, якое валакно, якую прадукцыю асобныя раёны здалі на пункты і адпаведна зьнізіць ім процант на якасьць.

Пытаньне якасьці павінна прыкаваць да сябе ўвагу партыйных, савецкіх і загатоўчых органаў. Нам трэба не абы якое выкананьне пляну, а выкананьне пляну па ўсіх паказьніках. Прамысловасьці патрэбен лён высокай якасьці. Усякія спробы здаваць дзяржаве горшы лён, горшую трасту павінны атрымаць самы бязьлітасны адпор. Трэба таксама самым суровым чынам караць тых «работнікаў» з апарату Заготлёну, якія прымаюць усякую непригодную прадукцыю, займаюцца очкаўірацельствам і наносяць вялікую шкоду дзяржаве, выконваючы заказ кулака.

БССР мае ўсе магчымасьці ў бліжэйшыя дні дамагчыся рашаючай перамогі на фронце лёназагатовак. Трэба толькі з усёй рашучасьцю выкарчаваць маленькія праявы дэмабілізацыйных настрояў, а такія настроі яўна праяўляюцца за апошнія дні. Трэба рашучым чынам узмацніць націск на кулацка-заможныя элементы, якія ўпарта сабатуюць лёназагатоўкі, трэба вынаць з радоў партыі і прыцягваць да суровай адказнасьці буржуазных перараджэнцаў з партбілетам у кішэні, якія ня здолелі змагацца за генэральную лінію партыі. Барацьба за лён высокай якасьці зьяўляецца неадымнай часткай усёй нашай барацьбы за лён.

Ва ўсіх партыйных арганізацыях, ва ўсіх калгасах трэба неадкладна разгарнуць шырокую прапрацоўку пастаноў апошняга аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Вакол распрацоўкі пашэньняў гістарычнага пленуму, вакол праграмы правадыра партыі тав. СТАЛІНА трэба ўзьняць высокую хвалю энтузіязму, актыўнасьці калгаснікаў, бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, накіраваўшы гэтую актыўнасьць на хутчэйшае і поўнае выкананьне ўсіх відаў загатовак.

Неадкладна забясьпечыць перамогу

МАЗЫР. Раён працягвае ганебна тупацца на месцы. На 11 студзеня плян бульбазагатовак па раёне выкананы толькі на 88,3 проц. прытым па цьвёрдых заданьнях плян выкананы ўсяго на 88,5 проц.

З 30 сельсаветаў раёну толькі 5 сельсаветаў выканалі і перавыканалі свае пляны.

5 сельсаветаў з 30. Гэта ганебнае зьявішча. Гэта—вынік кулацкага сабатажу, бязьдзейнасьці сельсаветаў і партячэек. Гэта—вынік прымірэнцтва да кулака, да яго сабатажу загатовак.

Яскрава аб гэтым сьведчыць «работа» НАВАСЁЛКАЎСКАГА сельсавету. Гэты сельсавет мае толькі 86 проц. выкананьня пляну бульбазагатовак. Тут цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі на 82 проц. Калгасы выканалі свой плян толькі на 81,1 проц.

Тут уся справа ў тым, што ў сельсавет пралезьлі клясава-варожыя элемэнты, якія гралі на руку кулаку, да памагалі яму сабатаваць бульбазагатоўкі. Да такіх членаў сельсавету належыць ВЕРАБЕЙ СЬЦЯПАН. Гэты падкулачнік па сваім вучастку дваёў зьменшаньня цьвёрдыя заданьні да кулакоў, зваліўшы ўвесь цяжар выкананьня пляну бульбазагатовак на беднякоў і сераднякоў. Гэта дало магчымасьць кулаку і яго агентуры сабатаваць загатоўкі, агітаваць працоўнае сялянства не здаваць (прадаваць) бульбу дзяржаве.

Другі член сельсавету МУШКАВЕЦ ПАРАСКА злосна ўхіляецца ад здачы (продажу) бульбы дзяржаве.

Усё гэта і прывяло да злачынага адставаньня Новасёлкаўскага сельсавету ў бульбазагатоўках, а разам з гэтым і да адставаньня ўсяго раёну.

Гэтага ні ў якім разе дапусьціць нельга. Кулацкія агенты павінны быць неадкладна выгнаны з сельсавету і адданы пад суд за зрыў бульбазагатовак, за патураньне кулаку. Раён мае ўсе магчымасьці неадкладна выканаць плян бульбазагатовак. Гэтага ён дабіцца толькі ў бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай, з кулацкім сабатажам, з усімі тымі, хто патурае гэтаму сабатажу.

Ачышчаючы свае рады ад агентуры кулака, ад буржуазных перараджэнцаў у партыі, якія прыкрываючыся партбілетам, робяць сваю брудную справу, накіраваную на зрыў мерапрыемстваў партыі і ўраду—партыйныя і савецкія арганізацыі Мазыршчыны павінны забясьпечыць неадкладную перамогу на бульбазагатоўчым фронце.

ЧОРНАЯ ДОШКА

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ І ІЛЬНУ:

ТАЛАЧЫНСКІ

(сакратар РК т. Славін, старшыня РВК т. Лагераў, упаўнаважаны ЦК т. Тамашэўскі).

ДУБРОВЕНСКІ

(сакратар РК т. Кацман, старшыня РВК тав. Семашко, упаўнаважаны ЦК т. Шаліма).

ГОРАЦКІ

(сакратар РК тав. Чарнабродаў, старшыня РВК тав. Кандраль, упаўнаважаны ЦК тав. Гнілякевіч).

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

СЕНЬНЕНСКІ

(сакратар РК т. Дашукевіч, старшыня РВК т. Себесевіч, упаўнаважаны ЦК т. Бэрзін).

СІРОЦІНСКІ

(сакратар РК т. Усенка, старшыня РВК т. Ражноўскі, упаўнаважаны ЦК т. Вільчак).

АСЬВЕЙСКІ

(сакратар РК тав. Сьцефановіч, старшыня РВК тав. Шкадрэвіч, упаўнаважаны ЦК тав. Блоўштэйн).

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ:

ПРАПОЙСКІ *)

КАРМЯНСКІ **)

(сакратар РК тав. Саладухін, рэдактар райгазэты „Колгасьнік Кармяншчыны" т. Касаткін, упаўнаважаны ЦК тав. Валодзька).

ЖЛОБІНСКІ

(старшыня РВК тав Антонаў, упаўнаважаны ЦК тав. Баскін)

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК УСІХ ВІДАЎ ЗАНЕСЕНЫ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ:

па Чачэрскім раёне: Глыбачанскі,
Дзяржынскім: вёскі Шчанаўшчына,
Пятрыкоўскім раёне: Пціцкі,
Клімавіцкім раёне: Красівіцкі сельсавет,
Лепельскім раёне: Ляхаўскі сельсавет і вёскі Кругляцы і Стальбцы,
Бягомльскім раёне: Дамражыцкі с/с,
Лагойскім раёне: Гайнінскі,
Наваўлянскім раёне: Мухаедаўскі,
Чашніцкім раёне: Ульяновіцкі і Стражвіцкі,
Магілеўскім раёне: Хонаўскі Рафалоўскі,
Клічаўскім Вірк ўскі, Грыбавецкі, Дубеньскі

па Сураскім: Камароўскі, Войтаўскі,
Аршанскім: Буеўскі,
Пухавіцкім: Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі,
Вушацкім раёне: Усайскі сельсавет,
Крычаўскім: Цяшанскі сельсавет,
Дрысенскім раёне: Юзэфоўскі і Каркалеўскі сельсаветы,
Рэчыцкім раёне: Артукаўскі, Холміцкі, Кірвіцкі сельсаветы,
Мсьціслаўскім раёне: Татаршанскі і Даўгавіцкі сельсаветы.

*) Сакратар Прапойскага РК тав. Іваноў, старшыня РВК т. Леоненко і ўпаўнаважаны ЦК т. Шындлер з чорнай дошкі зьнімаюцца як зьнятыя з работы пастановай ЦК КП(б)Б.

**) Старшыня Кармянскага РВК т. Новікаў зьнімаецца з чорнай дошкі, як зьняты з работы пастановай ЦК КП(б) Б.

Аб правядзеньні ленінскіх дзён

ЦК нацкампартый, усім абкомам і крайкомам УсеКП(б)

У сувязі з 9-й гадавінай сьмерці Леніна ЦК УсеКП(б) прапануе:

Правесьці шырокія партыйныя, камсамольскія, рабочыя і калгасныя сходы. Даклады павінны быць увязаны з работай аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), які падвёў вынікі пераможна завершанай пяцігодкі за чатыры гады, выкананай пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, яе ЦК, на аснове наказаў і ўказаньняў Леніна.

У ленінскі дні неабходна мабілізаваць працоўных вакол правядзеньня ў жыцьцё пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) вакол задач народна-гаспадарчага пляну 1933 г.—першага году другой пяцігодкі, мабілізаваць пільнасьць, энэргію і волю мас на справу выкананьня пляну першага году другой пяцігодкі, ахваленьне новых прадпрыемстваў прамысловасьці гаспадарча-палітычнага і арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў і саўгасаў і выгнаньня адтуль шкоднікаў і сабатажнікаў.

ЦК прапануе партарганізацыям у ленінскія дні сканцэнтраваць увагу ўсіх камуністаў на прапагандзе і пашырэньні ідэй ленінізму, наказаў і ўказаньняў Леніна, сканцэнтраваць увагу камуністаў і беспартыйных на задачах ачысткі радоў партыі ад прымазаўшыхся, чужых і няўстойлівых элементаў, ад жулікаў з партбілетам у кішэні.

ЦК УсеКП(б).

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ ад 8-І 1933 г.

У IX-ю гадавіну сьмерці Уладзіміра Ільліча Леніна, ажыцьцяўляючы заветы правадыра, пралетарыят СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе Ленінскага ЦК ў жорсткай барацьбе з клясавым ворагам, атрымаў перамогу, пасьпяхова завяршыўшы пабудову першай пяцігодкі ў 4 гады і ўступіўшы ў пабудову другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Ленінскія дні ў IX-ю гадавіну сьмерці У. І. ЛЕНІНА павінны праходзіць пад знакам мабілізацыі рабочых мас і сялянства на выкананьне і перавыкананьне плянаў 1933 г.—першага году другой пяцігодкі, завяршэньня ўсіх відаў дзяржаўных загатовак пад знакам барацьбы з агентурай клясавага ворага—апартуністамі ўсіх колераў.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапануе:

1. Усім ЦП Саюзаў, ГРПС і ФЗМК за час да Ленінскіх дзён правесьці на ўсіх прадпрыемствах, установах, саўгасах калгасах і МТС даклады аб ролі ЛЕНІНА ў міжнародным рэвалюцыйным руху правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі..

2. 21—22 студзеня правесьці на ўсіх прадпрыемствах, установах калгасах, саўгасах і МТС вечары прысьвечаныя сьмерці У. І. ЛЕНІНА.

3. Правесьці агляд работы прадпрыемстваў, устаноў, калгасаў, саўгасаў і МТС, якія носяць імя ЛЕНІНА, пад пунктам погляду выкананьня прамфінпляну і ўсіх гаспадарча-палітычных задач.

4. Шэфскім прадпрыемствам над вёскай ў час падрыхтоўкі і правядзеньня Ленінскіх дзён накіраваць для дапамогі ў падшэфныя вёскі і калгасы брыгады для правядзеньня ленінскіх дзён, заканчэньне ачлавы дзяржаўных загатовак збожа, лёну, мяса і інш. відаў, засыпкі насенных фондаў і падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Ўсю масавую работу па правядзеньні ленінскіх дзён увязаць з перавыбарамі ФЗМК і выкананьнем ўсіх гаспадарча-палітычных задач.

Толькі 0,3 проц. прыросту

Тэмпы бульбазагатовак па ЛЁЗЬНЕНСКІМ раёне па-ранейшаму застаюцца нездавальняючымі. У апошнія рашаючыя дні замест павышэньня тэмпаў раён за 13 студзеня дае прыросту ўсяго толькі на 0,3 проц. Асабліва зрывае выкананьне пляну аднаасобны сэктар, даўшы толькі 65,9 проц. выкананьня, а таксама цьвёрдавікі, якія плян выканалі на 69,1 проц. Гэтыя факты яскрава сьведчаць аб тым, што цэлы рад сельсаветаў (ДОБРАМЫСЬЛЯНСКІ, ГЛОДАНСКІ, БАБІНКАЎСКІ і іншыя) да апошняга часу ня здолелі разгарнуць належную работу па бульбазагатоўках, лібэралічаюць з кулаком, а бульбазагатоўкі былі кінуты на самацёк.

Частка аднаасобнікаў КАЛЬШАНСКАГА сельсавету ўпарта сабатуе загатоўкі. Нават член сельсавету вёскі Лугі — ВАРАНЦОВА АЛЁНА, якая павінна была паказваць прыклад ударнага выкананьня загатовак, не здала яшчэ ніводнага кілёграма бульбы пры самаабавязацельстве ў 3 цнт. Серадняк - аднаасобнік гэтай-жа вёскі КАВАЛЁЎ з самаабавязацельствам у 3 цнт ня здаў ніводнага кілёграма. Адна асобнікі вёскі МІТАЛУХІ — ФЯДОСАЎ СЯМЁН і ГАБАРАЎ ФОМА — таксама зрываюць загатоўкі. Усе гэтыя злосныя зрыўшчыкі - сабатажнікі бульбазагатовак не прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Ня лепшае становішча і па ДАБРАМЫСЬЛЯНСКІМ сельсавеце. У той час, як сельсавет на 12 студзеня 1933 году выканаў 80 проц. заданьня, ёсьць яшчэ цэлы рад паселішчаў, як: ВІНАКОРПА, ЦІХАНАВА, ЗАЛЕСЬЦЕ і іншыя якія ўпарта сабатуюць загатоўкі бульбы з-за чаго па сельсавеце не дадана дзяржаве яшчэ 600 цнт бульбы.

Зараз у паселішчах сельсавету працуе 25 асоб калгаснага актыву па ліквідацыі прарыву ў выкананьні бульбазагатовак.

Партячэйка і сельсавет паставілі перад сабою задачу — дабіцца ў бліжэйшыя дні 100 процантнага выкананьня бульбазагатовак. На выкананьне гэтай задачы мабілізаваны ўвесь актыў.

Л.

Лёнапрадукцыю—сацыялістычнай прамысловасьці

І па колькасьці і па якасьці выканаць плян лёназагатовак

Сурова караць за псаваньне лёнапрадукцыі

Трастой падсьцілалі жывёле

СІРОЦІНА. На 16 студзеня плян лёназагатовак па раёне выкананы толькі на 72,5 проц. Тэмпы паступленьня лёнавалакна за апошнія дні даюць зьніжэньне. Калі за 10 студзеня было загатоўлена 15,5 тоны, дык за 11 студзеня загатоўлена толькі 5,5 тоны, за 12—3,1 тоны і г. д. Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб паслабленьні барацьбы за лён.

Кулацкі сабатаж яшчэ не зламаны. ПАГАРЭЛІЦКІ сельсавет выканаў плян лёназагатовак па цьвёрдых заданьнях толькі на 66,8 проц. Намесьнік старшыні сельсавету ІВАНОЎ і сакратар КУХАРЭНКА патугаюць за можнікам. У в. ВУШЛЯЦІНА злосна сабатуюць загатоўкі аднаасобнікі П. САЦЫКОЎ, ІВАН БЕРАСЬНЕЎ, Н. ПАРЦЯНКАЎ і П ГУСАКОЎ. Але да апошняга часу сельсавет цацкаецца з імі і ня ўжыў ніякіх мер, каб плян па лёнавалакне быў выкананы.

У калгасе «Бязбожнік» зграя кулацкай агентуры займалася раскраданьнем лёнавалакна. У калгаснікаў Бераржнёва Д. і Касючэнка А. знойдзена 80 кг. пакрадзенага лёнавалакна, але зладзеі не пакараны.

Жарабіцкі сельсавет займае значную ўдзельную вагу ў раённым пляне лёназагатовак, але на 13 студзеня сельсавет выканаў плян лёназагатовак толькі на 49,2 проц. Старшыня калгасу імя 1-га МАЯ ВЕРАСЬНЕЎ разважае аб нерэальнасьці пляну, нічога ня робіць, каб выканаць заданьне. У камуне імя СТАЛІНА (Мышынвіцкі сельсавет) плян па лёназагатоўках выкананы толькі на 58 проц.. Замест таго, каб здаць (прадаць) лён дзяржаве, па распараджэньні брыгадзіра СУХАРСКАГА трастой падсьцілалі жывёле, крылі стрэхі, укрывалі гародніну і г. д. Старшыня камуны АРХІПАЎ глядзеў на гэта скоўзь пальцы. Партячэйка стаяла ў баку ад загатовак, сакратар ячэйкі Кавалёў увесь час бязьдзейнічаў. Перараджэнцы Архіпаў і Кавалёў замест таго, каб выправіць свае памылкі, каб па-бальшавіцку ўключыцца ў барацьбу за лён, апартуністычна разважаюць аб нерэальнасьці плянаў. Гэтых сабатажнікаў загатовак і агентуру кулацтва неабходна зараз-жа выключыць з радоў партыі і прыцягнуць да суровай адказнасьці. (БЕЛТА).

824 клгр. лёну звыш пляну

КРУПКІ. Калгас «Чырвоны Кастрычнік» сваячасова выканаў плян лёназагатовак. 45 тон трасты, вызначаныя калгасу паводле пляну, здана (прадана) ў вызначаны тэрмін. Шырока разгарнуўшы работу вакол пастаноў партыі і ўраду аб загатоўках, калгаснікі здаюць лён, які яны атрымалі ад калгасу пасьля выкананьня пляну лёназагатовак. Так, калгаснік РОГАЎ ЯНКА здаў 8 клгр, ГРЫБОЎСКАЯ—32 клг., РОГАЎ ПАЎЛА—25 клг., Рогава Натальля—14 клг. Разам усе калгаснікі здалі дзяржаве 824,5 клг. лёнавалакна высокай якасьці.

Калгаснікі калгасу «Чырвоны Кастрычнік» заклікаюць усе калгасы Крупчыны ўзяць з іх прыклад і арганізаваць масавую здачу лёну, які яны атрымалі ў іх асабістае карыстаньне.

ЗНАЕМЫ.

Раскрадаюць лён, разбазарваюцца прэміяльныя фонды

БАРЫСАЎ. Мы ўжо нядаўна ў нашай газэце паведамлялі аб тым, што на Барысаўскай базе Заготлёну вялізарныя кіпы лёнавалакна ляжаць пад адкрытым небам і псуюцца ад дажджу і сьнегу. Але канторай не пачуты сыгналы друку, па-ранейшаму існуюць абураючыя клапосіны да загатоўленай лёнапрадукцыі. Адпраўка валакна праводзіцца нерэгулярна, мае месца затаварваньне. Гэта ёсьць вынік поўнай бязьдзейнасьці апарату Заготлёну, які не клапоціцца аб тым, каб загатоўленае валакно адразу адгрузіць.

Райспажсаюз таксама нядбайна адносіцца да лёназагатовак. Пры здачы лёнапрадукцыі на прыёмачныя пункты сельСТ не прадстаўляюць накладных на зданую прадукцыю, лён здаецца «на павер», не вядзецца дакладнага вучоту, колькі і якое сельСТ здае лёнапрадукцыі.

У пасобных сельспажтаварыствах маюць месца выпадкі ракавання валакна; некаторыя крамнікі не выдаюць квіткоў здатчыкам. Такія факты наглядаюцца ў ЗАБАШАЎСКІМ і БРОДКАЎСКІМ сельспажтаварыствах. Прэм'яльныя фонды, прызначаныя для стымуляваньня лёназагатовак, разбазарваюцца служачымі і рабочымі апарату Заготлёну і сельСТ.

Такое становішча ня можа быць цярпіма. Трэба карэнным чынам перабудаваць работу Заготлёну. Загатоўленае лёнавалакно неабходна адразу ж адгружаць. Трэба сурова караць за раскрадваньне лёнапрадукцыі і разбазарваньне прэм'яльных фондаў.

М. РУМЯНКА.

Аб адтэрміноваваньні IV сэсіі ЦВК БССР X скліканьня

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР, скліканьне IV сэсіі Ц К БССР, якое было вызначана на 23 студзеня 1933 г., ПЕРАНОСІЦЦА на іншы тэрмін.

Аб дні скліканьня б дзе апублікавана асобна.

Сакратар ЦВК БССР М. Гнілякевіч.

12 сельсаветаў Случчыны ў палоне прарыву

СЛУЦАК. (Наш кар.). Плян бульбазагатовак па Слуцкім раёне выкананы на 98 проц.

Перадавыя сельсаветы ўжо выканалі і перавыканалі пляны бульбазагатовак. ІСЕРСКІ сельсавет выканаў плян на 108,4 проц., ШЫШЧЫЦКІ—на 103 проц., ПЕРШАМАЙСКІ—на 103 проц., МУСІЦКІ—на 102 проц.

Аднак, разам з перадавымі, рад сельсаветаў ганебна зрываюць бульбазагатоўкі. Вось зрыўшчыкі, якія маюць запазычанасьць па бульбазагатоўках: БЕЛІЦКІ, БОКШЫЦКІ, В.-СЬЛІЎСКІ КАЗЛОВІЦКІ, КАСТРЫЧНІЦКІ, ЛІПЕНЬСКІ, ЛУЧНІКОЎСКІ МЯЛАШКОЎСКІ, САРАГОЎСКІ, СЯРЭДНІКАЎСКІ, СТАРЭЎСКІ і ПАЛІКАРПАЎСКІ сельсаветы. Гэтыя сельсаветы павінны зараз-жа зрабіць рашучы пералом ра зьбіць сабатаж кулака, даць 100 проц. пляну бульбазагатовак.

Зрыўшчыкаў, бязьдзейнікаў, кулацкіх сабатажнікаў трэба прыцягнуць да самай суровай адказнасьці.

Л. ХАЎКІН

У жорсткай кл савай барацьбе—да перамог

БАБРУЙСК. 16-І. (Па тэлефоне ад наш. кар.). Разгортваючы бязьлітасную барацьбу з клясавым ворагам і яго агентурай, з кулацкім сабатажам і з буржуазнымі перараджэнцамі ў радох партыі,—Бабруйшчына дамагліся значных посьпехаў у выкананьні пляну загатовак.

Плян збожжазагатовак выкананы па ўсіх сельсаветах раёну. На 16 студзеня раён дамогся 100 процантнага выкананьня пляну загатовак лёну.

Плян загатовак бульбы раёнам выкананы на 104 проц. Выкананьне пляну сеназагатовак дасягнула 102,7 проц., лёнасемя—106,9 проц.

Раённыя арганізацыі пераключыліся на падцягваньне адстаючых сельсаветаў з тым, каб у самыя бліжэйшыя дні дамагчыся выкананьня пляну па кожным сельсавеце, вёсцы, калгасе, сялянскім двары.

А. ДАМБРОЎСКІ.

Аб ходзе загатовак лёнапрадукцыі па БССР

(у процантах)

	Лёнавалакно	Лёнасемя
На 16-І	77,4	91,9
На 15-І было	76,7	91,5

У чым прычына адставаньня Санюкоўскага сельсавету

ЕЛЬСКІ. На 14 студзеня плян бульбазагатовак па САНЮКОЎСКІМ сельсавеце выкананы толькі на 87 проц. Старшыня сельсавету САМОЙЛЕНКА не рабіў націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, кулацкі сабатаж загатовак не зламаны.

Так, у вёсцы ПАЛАЎКІ недаразмеркавана 4 тоны бульбы. САМОЙЛЕНКА ведаў аб гэтым, але ніякіх мер не прымаў. Ён проста дапамагаў кулаку узрываць загатоўкі. Сакратар партячэйкі сельсавету КАЎДЭРКА на мест барацьбы за загатоўкі, сыстэматычна п'янствуе.

Блізкі да КАЎДЭРКІ таварыш па п'янках — КІМПАЎ ходзіць па хатах і гаворыць: «Мая справа хадзіць, а ваша, — не здаваць бульбу». Упаўнаважаны РВК МАСЬЛЯНІКАЎ не адстаў ад іх. Ён тыдні «працаваў» у вёсцы ПАЛАЎКІ і «ня ведаў», што там ёсьць цьвёрдавікі.

Другі ўпаўнаважаны РК КП(б)Б КАЦЮБІНСКІ быў накіраваны ў Санюкоўскі сельсавет. Але і гэты, «упаўнаважаны» не далёка адышоў ад МАСЬЛЯНІКАВА. Замест рашучай барацьбы з кулацкім сабатажам загатовак бульбы, КАЦЮБІНСКІ стаў прасіць кулакоў: «здаць па пудзіку і больш вас ніхто чапаць ня будзе.

РКК РСІ павінна зрабіць адпаведныя вывады. Сабатажнікам загатовак ня месца ў радох партыі, яны павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасьці. (БЕЛТА).

БРЫГАДЗЕ--ЦЭНТРАЛЬНАЕ МЕСЦА У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Перамагаючы кулацкі сабатаж, неадкладна закончыць стварэньне насенных і страхавых фондаў

Буксірная брыгада на дапамогу адстаючаму сельсавету

РАГАЧЭЎ. (Наш кар). Плян засыпкі насенных фондаў збожжавых культур па калгасах раёну выкананы толькі на 91 проц., страхавыя фонды на 60 проц.

Зрываецца засыпка страхфондаў па ГАДЗІЛАВІЦКІМ сельсавеце, дзе плян выкананы толькі на 22 проц., СЬВЯЦКІМ на — 16 проц., ЦІХНІЦКІМ на — 36 проц., ДВАРЭЦКІМ на — 36 проц. і ЗБОРАЎСКІМ — 3 проц.

Старшыня Гадзілавіцкага сельсавету ГАЙДУКОЎ ня цікавіцца засыпкай страхавых фондаў па аднаасобным сэктары. Прысланы туды ўпаўнаважаны РВК і РК т. РАБОЎСКІ не забяспечыў належнага перакону ў ходзе гэтай работы, у выніку чаго сельсавет трапіў на чорную дошку.

Надзвычай мала тут зрабілі ўпаўнаважаныя РВК тт. ФАРБЯРАЎ, ХІЛОКЕВІЧ, ДРАЧОЎ і КУРГАНСКІ ў той час, калі за засыпку страхфондаў у сельсавеце ахвяны непасрэдна адказваюць.

Лучынскі сельсавет, які першы ў раёне засыпаў страхфонды у аднаасобным сэктары, выслаў буксірную брыгаду ў складзе тт. СВАЧАНА, МАРМОЗАВАЙ і ДРАБКОВА ў дапамогу адсталаму Гардзілавіцкаму сельсавету.

КУЛЯШОЎ Хв.

Ні адзін калгас яшчэ ня мае насенфондаў

(Ад нашага спэцкора)

ЧАВУСЫ. Выязной рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» зроблена праверка засыпкі насенных і страхавых фондаў па Антонаўскім сельсавеце.

Праверка паказала, што сельсавет яшчэ не пераключыўся на тэму важнейшую палітычна-гаспадарчую кампанію. Пляны сяўбы калгасы атрымалі толькі 9 студзеня, а па аднаасобным сэктары яшчэ і на сёпешні дзень плянаў няма. З прычыны гэтага калгасы плянаў веснавой сяўбы не абгаворылі на агульных сходах.

Апрача таго, калгасу «Чырвоны змагар» не хапае насеньня: бульбы — 5 тон, аўса—6,5 тон, пшаніцы—7 цит., бо насеньне было разьмеркавана паміж калгасьнікамі.

Зерняачышчальныя машыны не адрамантаваны і ачыстка насеньня па сельсавеце не праводзіцца.

Для таго, каб сапраўды ажыцьцявіць пастановы партыі і ўраду аб засыпцы насенных і страхавых фондаў, сельсавет і праўленьні калгасу павінны зараз-жа абгаварыць плян сяўбы на сходах калгаснікаў і аднаасобнікаў, давесьці пляны да кожнага двара. Трэба неадкладна адрамантаваць зерняачышчальныя машыны і поўнасьцю іх нагрузіць.

БУРДЫКА.

Дзе брыгадзір?

(Ад нашага спэцкора)

БУДА-КАШАЛЁВА. Засыпка насенных і страхавых фондаў ў радзе калгасаў раёну граходзіць недапушчальна марудна. Так, па калгасах Кубіцкага сельсавету насенныя фонды засыпаны на 38,6 проц., Любавічскага—61 проц., Б-Кашалёўскага—62,9 проц.

У аднаасобных калгасах існуюць спажывецка-кулацкія адносіны да стварэньня насенных фондаў. Падымаецца размова аб тым, каб скараціць пасеўную плошчу, зьменшыць плян засыпкі насенфондаў і за гэты кошт павялічыць расцэнку працадня. Гэта значыць, ідуць размовы аб тым, каб частку зярновых культур, вызначаных для стварэньня насенфондаў, пусьціць у разьмеркаваньне паміж калгасьнікамі.

Такія настроі асабліва выявіліся ў калгасах: «Шлях да камуны», «Камінтэрн» (Буда-Люшаўскі сельсавет). Гэтыя калгасы засьмечаны кулацкімі элементамі. У калгасе «Шлях да Камуны» члены праўленьня—ПУСЕЁЎ ГАЎРЫЛА і СТАРАСОТНІКАЎ ЗАХАР былыя цьвёрдазікі.

У калгасе «Дыктатура пралетарыяту» гэтага-ж сельсавету, разбазарылі яравыя культуры, і зараз разьлічваюць на атрыманьне насенпазыкі. У гэтым калгасе ёсьць 5 былых цьвёрдавікоў.

Клясавы вораг ужывае розныя маневры, каб сарваць засыпку насенных і страхавых фондаў, каб сарваць веснавую сяўбу першага году другой пяцігодкі.

Брыгадзіры калгасных вытворчых брыгад павінны былі-б прыняць актыўны удзел у засыпцы насенных і страхавых фондаў, пачаць з гэтага падрыхтоўку сваіх брыгад і вучасткаў да веснавой сяўбы. На справе гэтага няма. У калгасах «Шлях да камуны», «Камінтэрн» і «Дыктатура пралетарыяту» у час засыпкі насенных і страхавых фондаў зусім не прыкметна была роля брыгадзіраў калгасных вытворчых брыгад.

Гэта сведчыць аб тым, што калгасна-вытворчай брыгадзе не надаецца яшчэ належная ўвага ў калгасах Буда-Люшаўскага сельсавету.

Гэты недахоп трэба неадкладна выправіць. Вытворча-калгасная брыгада на чале са сваім брыгадзірам павінна ўжо зараз весьці актыўную барацьбу за посьпех веснавой сяўбы, за высокі ўраджай, даваць рашучы адпор кулацкім імкненьням сарваць веснавую сяўбу.

Ул. ДУБРОЎСКІ.

Падрыхтоўка да сяўбы ігнаруецца

БАРЫСАЎ. Засыпка насенных і страхавых фондаў па раёне праводзіцца марудна. Калгасы БЕЛЯЦІЦКАГА сельсавету зусім ігнаруюць гэта важнейшае мерапрыемства. Толькі адзін калгас «ЧЫРВОНЫ БАРАЦЬБІТ» заняўся гэтай справай. Засыпка насенфондаў па іншых калгасах не праводзіцца.

Па МЕТЧАНСКІМ сельсавеце да стварэньня насенных фондаў прыступілі толькі два калгасы — «РОЎ» і «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ». Зусім бязьдзейнічаюць калгасы «ПРАЦА», «ПЕРШАГА МАЯ», «ЧЫРВОНАЯ МЕТЧА» імя МОЛАТАВА і «ПЕРАМОГА». У калгасе «Вызваленьне працы» разбазарана насеньне і зараз няма чаго засыпаць.

Сельсаветы, партыйныя ячэйкі і ўпаўнаважаныя РК і РВК павінны наладзіць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам засыпкі насенных і страхавых фондаў. Трэба сурова карань тых кіраўнікоў калгасаў, якія зрываюць падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

В. РУМЯНКА.

Жаўновіч сьвяткуе каляды

СЛУЦАК. (Наш кар.). Перадавыя калгасы раёну разгарнулі бальшавіцкую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Калгасы: імя КАРЛА ЛІБКНЭХТА і «МАЛЫЯ АЎХОВІЧЫ» (Аўховіцкі сельсавет) цалкам выканалі плян па стварэньні насенных фондаў. Насеньне ачышчана.

Адначасова па гэтых калгасах разгортваецца рамонт с.-г. машын і інвэнтара. За брыгадамі замацаваны вытворчыя вучасткі, цягавая сіла, с.-г. інвэнтар.

Але побач з перадавымі ёсьць гаспадаркі, якія ігнаруюць падрыхтоўку да сяўбы. Так, калгас «РУБЕЖ» (гэтага-ж сельсавету) да апошняга часу не прыступае да стварэньня насенных фондаў. Старшыня калгасу ЖАЎНОВІЧ мала цікавіцца гэтым пытаньнем; замест работы ён сьвяткуе каляды, наладжвае п'янкі. Сельсавет павінен не адкладна прымусіць кіраўніцтва калгасу «Рубеж» заняцца падрыхтоўкай да веснавой сяўбы і тэрмінова закончыць засыпку насенных і страхавых фондаў.

ХАЎКІН.

За ГРАНІЦАЙ

Паведамленьне ТАСС

13 сьнежня 1932 г. японскае міністэрства замежных спраў уручыла паўпраду СССР у Токіё т. Траяноўскаму вэрбальную ноту, у якой зьмяшчаецца афіцыйны японскі адказ на прапанову, якая ад імя савецкага ўраду была зроблена тав. Літвінавым 31 сьнежня 1931 году пану Йёсізаве, які варочаўся ў той момант праз Маскву ў Токіё для заняцьця пасады міністра замежных спраў.

У ноце, уручанай т. Траяноўскаму японскі ўрад зазначае, што магчымы розныя думкі па пытаньні аб часе, які можа быць вызначаны адпаведным для заключэньня пакту аб ненападзе. Адна з гэтых думак стаць за заключэньне пакту аб ненападзе, якія забясьпечыў у далейшым вырашэньне розных спрэчных пытаньняў паміж абедзьвума краінамі. Другая процілеглая думка заключаецца ў тым, што спачатку павінны быць зьнішчаны прычыны магчымых спрэчак і толькі потым могуць быць разгледжаны такія больш агульныя пытаньні, як пакт аб ненападзе. Японскі ўрад са свайго боку таксама знаходзіць, што яшчэ не насьпеў момант для заключэньня пакту аб ненападзе ў сучасны момант і лічыць за лепшае заняцца вырашэньнем розных пытаньняў, якія ёсьць у адносінах паміж абедзьвума краінамі. Для сучаснага моманту японскі ўрад аддаў-бы перавагу абмену думкамі аб мэтадах папярэджаньня і мірнага ўрэгуляваньня мясцовых сродкамі трудносьцяй, якія могуць узьнікнуць з прычыны супрыкасьненьня войск абодвых бакоў—напрыклад шляхам стварэньня японска-савецка-манчжурскага камітэту для папярэджаньня пагранічных інцыдэнтаў.

У адказ на паведамленьне японскага ўраду, адказ'ўшага такім чынам для сучаснага моманту прапанову СССР аб заключэньні савецка-японскага пакту аб ненападзе, т. Траяноўскі ўручыў 4 студзеня 1933 году японскаму міністэрству замежных спраў вэрбальную ноту, у якой савецкі ўрад заяўляе аб сваёй поўнай згодзе з пер шай з вышэй паданых думак і са заволеньнем адзначае, што гэты пункт погляду падзяляецца японскімі колямі. Савецкі ўрад выказвае жаль з прычыны таго, што японскі ўрад не знайшоў магчымым стаць на гэты пункт погляду і далучыўся да супроцьлеглай думкі, пасьпяшаўшае разьвіцьцё якой няўхільна прыводзіць да поўнага адмаўленьня ідэй пактаў аб ненападзе, якія заключаюцца ў пакце Келога—Брыяна; міжнароднага адмаўленьня ад вайны ў якасьці сродку вырашэньня спрэчак. Японскі ўрад відаочна лічыць магчымым заключэньне згоды аб ненападзе толькі паміж такімі ні дзяржавамі, у якіх ня існуе ніякіх спрэчак, але пры сёпешній эканамічнай і палітычнай узаемазалежнасьці паміж краінамі такое становішча наўрад-ці існуе і наўрад-ці магчыма, асабліва паміж дзяржавамі, якія знаходзяцца больш-менш у блізкім суседзтве. Апрача таго вырашэньне існуючых спрэчак не гарантуе ад узьнікненьня новых спрэчак у далейшым.

Савецкі ўрад зазначае далей у сваёй ноце, што дзяржавы, якія заключылі з СССР пакт аб ненападзе зусім не прызналі гэтым адсутнасьці якіх-бы то ні было ўзаемных спрэчак і прэтэнзій, у прыватнасьці СССР у самы апошні час згаджаўся на заключэньне пакту аб ненападзе з суседняй дзяржавай, з якой ён мае спрэчную граніцу вельмі абгрунтаваных тэрытарыяльных прэтэнзіі. Сэнс пакту аб ненападзе, як і пакту Келога—Брыяна, па думцы савецкага ўраду, у тым і заключаецца, што дзяржавы, выходзячы з наяўнасьці або магчымасьці паміж імі спрэчак, адмаўляюцца ад вырашэньня іх гвалтоўным шляхам. Савецкі ўрад са свайго боку зусім не знаходзіць, каб паміж СССР і Японіяй існавалі такія спрэчкі, якія нельга было-б, або якія ён не згадзіўся-б вырашыць мірным шляхам.

Адмаўленьне гэтага прывяло-б да супярэчнасьці з пактам Келога—Брыяна, удзельнікамі якога зьяўляюцца як СССР, так і Японія.

Прапануючы Японіі пакт аб ненападзе савецкі ўрад зусім не ігнараваў гэтага міжнароднага пакту, а змкнуўся толькі ўзмоцніць яго і шляхам двухбаковай згоды пашырыць і прыстасаваць яго да асаблівасьцяй адносін абядзьвух краін.

Савецкі ўрад заяўляе ў сваёй ноце, што яго прапанова ня была выклікана меркаваньнямі моманту, а вынікае з усёй яго мірнай палітыкі і тэзу асцвэцца ў сіле і ў далейшым. Савецкі ўрад выказвае сумненьне ў тым, каб адмова аднаго боку ад згоды аб ненападзе садзейнічала стварэньню атмасфэры спрыяючай для вырашэньня ўсіх спрэчак і ўладжваньня непаразуменьняў.

Савецкі ўрад прымае ад ведама заяву японскага ўраду, якая заключаецца ў вэрбальнай ноце аб тым, што Японія і Савецкі саюз узаемна гатовы скрупулёзна ўважаць суверэнныя правы адзін другога і пунктуальна ўстрымлівацца ад парушэньня ў малейшай ступені іх межаў і выражаюць упэўненасьць у тым, што пры дакладным выкананьні гэтага абавязацельства ня ўзьнікне, як і ў мінулым, ніякіх пагранічных інцыдэнтаў пры часовым знаходжаньні японскага войска ля Савецкай граніцы.

Разам з тым Савецкі ўрад выказвае сваю гатоўнасьць вывучыць і абмеркаваць японскую прапанову аб стварэньні японска-савецка-манчжурскага камітэту для папярэджаньня пагранічных інцыдэнтаў па прыкладзе такіх-ка камітэтаў, існуючых у Савецкага саюза з Румыніяй, Польшчай і іншымі суседнімі дзяржавамі.

Аб справе тав. Бялугі

(Парткалектыў Белкаапсаюзу)

Пастанова Прэзыдыуму МенгарКК КП(б)Б ад 3-I 1933 г.

Бялуга Мікола Ільліч, член партыі з 1920 г., беларус, 1885 г. нараджэньня, па сацыяльным становішчы служачы-настаўнік, па паходжаньні селянін, з 1905 па 1906 г. быў у партыі эсэраў, у 1918 г.—у партыі левых эсэраў, па яго словах у 1906 г. быў арыштаваны за арганізацыю сялянскіх гурткоў, скончыў настаўніцкую школу, у старой арміі служыў з 1914 па 1917 г. радавым, а з 1917 па 1918 падпрапаршчыкам, у белай арміі служыў з 14-VIII-1918 г. па сакавік 1919 г.—у арміі Калчака, у Чырвонай арміі служыў з 1919 па 1924 г. у якасьці палітасьветчыка і партыйнага работніка. Займаў пасады: нач. культпропу, нач. агітпропу ГАСКРА агітпропу 4 дывізіі, загадчыка менскім АКРАНА, віцэпрэзыдэнта Акадэміі Навук Беларусі. Партыйнага паданадаў: у 1930 г. атрымаў вымову ад ЦКК КП(б)Б за недаволі рашучую барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, працуючы ў Акадэміі Навук, у 1932 г. атрымаў суровую вымову ад МенгарКК КП(б)Б за трацкісцкае, выступленьне, у момант зьнікненьня справы і ў даны час працуе загадчыкам плянава-эканамічнага сэктару ў Белкаапсаюзе.

Абвінавачваецца ў тым, што:

1. Пасьля таго, як атрымаў некалькі партыпагнаньняў: вымову ў 1930 г. ад ЦКК КП(б)Б за прымірэнцкія адносіны да беларускага нацыянал-дэмакратызму, суровую вымову ў 1932 г. ад МенгарКК КП(б)Б за трацкісцкае выступленьне, ня гледзячы гаксама на падачыя заявы ў МенгарКК з абяцаньнем на практычнай рабоце рашуча выправіць дапушчаныя ім памылкі, Бялуга ня толькі не паказаў на справе сваю адданасьць партыі і імкненьне праводзіць на практыцы яе генэральную лінію, але наадварот яўна ашуквай партыю і, прыкрываючыся фалшывым нацыянальным сьцягам у сваёй практычнай працы, паказаў свой палітычны твар нацыянал-дэмакрата.

Не выступаючы адкрыта на працягу доўгага часу ў ўсіх прынцыповых палітычных пытаньнях, ня прымаючы ні якага ўдзелу ў рабоце парт'ячэйкі—Бялуга, у часе, калі ўся партарганізацыя праводзіць напружаную работу па выкананьні дзяржаўных загатовак, даючы рашучы адпор кулацкаму саботажу і яго агентуры, ня толькі ня прымаў асабістага ўдзелу ў гэтай важнейшай палітыкампаніі, але нават сьвядома імкнуўся ўтойваць ад партарганізацыі свае погляды і адмовіўся выступіць на агульным партсходзе пры працоўцы пастановы ЦК КП(б)Б аб загатоўках, спасылаючыся на тое, што ён ня ў курсе справы загатовак і ня мае лічбовых даных.

3. «Нэйтральны» ва ўсіх важнейшых палітычных пытаньнях і мерапрыемствах партыі, Бялуга прыкрываючыся асабіста фальшывым нацыянальным сьцягам, на практычнай рабоце ў Белкаапсаюзе ў якасьці загадчыка плянава-эканамічным сэктарам праводзіў сваю контр-рэвалюцыйную нацдэмаўскую дзейнасьць, якая праявілася ў тым, што пры спуску плянаў (дырэктыва па складаньні плянаў IV кварталу і пляну на 1933 г.), дае, перакручваючы асноўныя задачы сыстэмы, у дырэктыўнай часьці сьвядома ігнараваў партыйныя ўстаноўкі і ні слова не ўпамянуў аб загатоўках, таксама злачын на ўпушчэньні плянаваньне крэдытаў для самазагатовак.

Замест скарыстаньня плянаў, як сродку арганізацыі работы капсыстэмы і мабілізацыі яе на канкрэтнае выкананьне партыйных задач, што стаяць перад спажывецкай кааперацыяй, Бялуга выпустошыў палітычны зьмест пляну, яго асноўнае значэньне.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум пастанаўляе:

Выключыць Бялугу з радоў партыі за тое, што ён ашуквай партыю, прыкрываючыся фальшывым сьцягам.

1. Адзначаючы, што бюро п-к. Белкаапсаюзу правільна паставіла пытаньне аб выключэньні Бялугі з радоў партыі, аднак пры абгаварэньні яго справы на агульным сходзе п-к. ня было дана рашучага адпору праяўленьням гніла-лібэральных адносін з боку асобных членаў партыі, якія выступалі ў абарону Бялугі (Сулькіна, Вербі), з прычыны чаго агульны сход скасаваў пастанову п-к. і пакінуў Бялугу ў радох партыі; толькі на наступным сходзе гэта грубейшая палітычная памылка была выпраўлена. Бялуга быў вылучаны з партыі—за што бюро п-к. абвясьціць вымову.

2. Адзначыць, што з боку фракцыі прэзыдыуму Белкаапсаюзу была праяўлена палітычная сьлепата і гніла-лібэральныя адносіны да нацыянал-дэмакрата Бялугі, якія праявіліся ў тым, што ў сваёй пастанове зд 25-IV-1932 г. фракцыя прэзыдыуму адзначыла, што Бялуга за перыяд яго работы ў Белкаапсаюзе праводзіў генэральную лінію партыі—аб чым паставіць пытаньне перад ЦКК КП(б)Б і прасіць працягнуць вінаватых да партадказнасьці.

3. Даручыць парткалегіі МенгарКК мець асобнае меркаваньне аб членах партыі—т. т. Вербе, Сулькінай, якія на агульным сходзе выступілі ў абарону Бялугі, а таксама аб т. т. Сарокіне і Арапчыку, якія па-прэмірэнцку адносіліся да гэтай справы.

Нам. старшыні МенгарКК КП(б)Б
ХАДАСЕВІЧ

Маніфэст Эсэнскай канфэрэнцыі

БЭРЛІН. 15-1. «РОТЭ ФАНЭ» публікуе маніфэст да прапоўнай моладзі, ухвалены на канфэрэнцыі прадстаўнікоў кампартыі і камсамолу ГЕРМАНІІ, ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ, ПОЛЬШЧЫ, ЧЭХА-СЛАВАКІІ, БЭЛЬГІІ, АЎСТРЫІ і ЛЮКСЭМБУРГУ, якая адбылася ў ЭСЭНЕ. У маніфэсьце гаворыцца:

«Пануючая клясa ўсіх капіталістычных краін нясупынна ўзмацняе падрыхтоўку імпэрыялістычнай вайны. Хор прыхільнікаў капіталістычных урадаў, хор фашыстаў і сацыял-дэмакратаў ня спыняе заклікаць моладзь да абароны бацькаўшчыны. Ваш галоўны вораг у вашых уласных краінах, — гэта — капіталістычныя ўрады, гэта — паны з II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ, якія душаць вашу барацьбу супроць зьніжэньня зарплаты, якія дапамагаюць надзець на вас новае ярмо мілітарызму; гэта — фашысты, якія арганізатары тэрору і ашуканства, іс наваньне якіх грунтуецца на бязьмежным здрадніцтве з боку II Інтэрнацыяналу.

У гэтым годзе — гаворыцца далей у маніфэсьце — калі мы адзначаем 50-ую гадавіну з дня сьмерці КАРЛА МАРКСА, калі рэвалюцыйны марксызм сьвяткуе перамогу над фальсыфікатарамі марксызму з II Інтэрнацыяналу; у гэтым годзе РАБОЧАЯ СЯЛЯНСКАЯ І ВУЧНЕЎСКАЯ МОЛАДЗЬ НАКІРОЎВАЕ СВОЙ ЗРОК НА СССР — ГЭТЫ ГІГАНЦКІ ТРЫУМФ МАРКСЫЗМУ — ЛЕНІНІЗМУ НАД КАПІТАЛІСТЫЧНЫМ ХАОСАМ».

Эсэнская канфэрэнцыя прадстаўнікоў кампартыі і камсамолу закліча ўсю працоўную моладзь капіталістычных краін ЗМАГАЦЦА СУПРОЦЬ МІЛІТАРЫЗАЦЫІ, СУПРОЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ, АБАРАНЯЦЬ СССР СУПРОЦЬ ПАГРАЖАЮЧАЙ НЕБЯСПЕКІ ІНТЭРВЭНЦЫІ. Праз усе граніцы злучаць фронт міжнароднай клясавай барацьбы, стварыць усюды камітэты адзінства, узмацніць работу сярод новабранцаў, праводзіць забастоўкі супроць вырабу і транспартаваньня ваеннай амуніцыі.

Памяці Лібкнэхта і Люксэмбург

БЭРЛІН. 16-1. У сувязі з гадавінай забойства Карла ЛІБКНЭХТА і РОЗЫ ЛЮКСЭМБУРГ, учора ля магілы забітых сабраліся дзесяткі тысяч пралетараў. Сумесна з германскімі пралетарамі на могілкі ішла група кітайскіх рэвалюцыянэраў.

На мітынгу ля магілы выступіў прадстаўнік французкай кампартыі ТОРЭЗ, даўшы яскравы малюнак барацьбы французкага пралетарыяту супроць вайны і ўказаў, што французкая кампартыя разам з кампартыяй Германіі высока трымае сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму, сьцяг ленінізму.

ТОРЭЗ заявіў: «Будучы вернымі ўрачыста данай нядаўна намі ў Парыжы клятве ў прысутнасьці ТЭЛЬМАНА, мы, французкія рабочыя зноў працягваем германскім пралетарам руку і заяўляем ім: «мы вас будзем падтрымліваць, мы вашы браты».

«І калі буржуазія асьмеліцца пачаць вайну супроць СССР, дык мы сумесна, рука аб руку, будзем абараняць нашу сацыялістычную бацькаўшчыну. Германскія браты рэвалюцыйнага Бэрліну, — закончыў Торэз, — МЫ СУМЕСНА ЗМАГАЕМСЯ ПАД СЬЦЯГАМ ЛЕНІНА, ПАД СЬЦЯГАМ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ І РАЗАМ ПЕРАМОЖАМ».

Прамова ТОРЭЗА справаджалася бурнымі авацыямі. Ад германскай кампартыі на мітынгу выступіў саратнік Лібкнэхта і Люксэмбург — ВІЛЬГЕЛЬМ ПІК.

Амэрыканскія лётнікі на службе ў Кітаі

ТОКІЕ. 16-1. У міністэрстве замежных спраў зазначаюць, што паводле даных з Кітаю, у асабістым складзе кітайскага паветранага флёту ня менш 45 амэрыканскіх лётнікаў, якія лічацца па - ранейшаму на сапраўднай ваеннай службе морскага ведамства ПАЗШ.

Амэрыканскае пасольства ў Токіё сёньня апублікавала заяву, якая абвяргае «паведамленьні японскага друку аб заключэньні згоды паміж ПАЗШ і Кітаем па забясьпечэньні Кітаю грашыма, узбраеньнем і баявымі прып. самі». Заява абвяргае таксама «чуткі» аб тым, што «ПАЗШ прадставілі Кітаю пазыку ў 20 млн. кітайскіх даляраў». У заяве амэрыканскага пасольства нічога не гаворыцца аб адпраўцы ўзбраеньня і самалётаў у Кітай прыватнымі фірмамі

Масавае звальненьне батракоў

«Работнік» у № 8 паведамляе, што аддзел КУТНАЎСКАГА прафсаюзу сельгаспрацоўцаў атрымаў даныя з 96 маёнткаў гэтага павету аб тым, што звальняецца 1995 батракоў, якія разам з сем'ямі складаюць 3724 чал.

Таксама ПУЛТУСКІ аддзел, які ахапляе паветы ПУЛТУСКІ, МАКОЎСКІ і ЦЕХАНОЎСКІ, паведамляе, што звольнена 2000 сем'яў батракоў.

Усюды працэдура звальненьня адбываецца аднолькава. Абшарнікі спрабуюць навязаць рабочым ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ўмовы з ПАМЕНШАНАЙ ЗАРПЛАТАЙ. Усе гэтыя рабочыя маюць у памешчыкаў па некалькі месяцаў нявыплачанай зарплаты.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

КІНО „ПЛЕЯДЫЯНАЛ“ Каса а д 12 г. дня

Ад 15 студзеня маставі фільм вытворчасьці Саюзкіно

— Камэдыянтка —

У зьвязку з тым, што рад арганізацый яшчэ заготуль не прадставілі на зацьверджаньне адпускныя цэны на мясовыя будматэрыялы ў адпаведнасьці з пастановай СНК БССР ад 14-VII 1933 г. за № 319, чым пазбаўляюць магчымасьці агаласіць іх, што выклікае сьпяшэньне аплаты рахункаў банкамі

абвяшчаецца, што

ўсе арганізацыі і ўстановы, якія вытвараюць МЯСОВЫЯ БУДМАТАР'ЯЛЫ

(фібраліт, бутавы камень, граві, пясок і інш.) павінны праз свой рэспубліканскі цэнтр (кір. мясовай прамысл. Наркамгас, Белжыдсаюз і інш.) прадставіць 25-I 1933 г. у бюро цэн на назвы ней тразьв. кір. упаўн. НКЦП СССР праек адпускных цэн на 1933 год

Да праекту павінны быць даданы падрабязныя разьлікі ў пацьвярджэньне і абгрунтаваньне адпускной цэны, у прыватнасьці: 1) справазданьні калькуляцыі камэрцыйнага сабекошту 1932 г., 2) абцверджаньне проц зьніжэньня камэрцыйнага сабекошту на 1933 г., 3) якія адпускныя цэны існавалі да гэтага, 4) тлумачальную запіску Пасежаньне камісіі бюро цэн адбудзецца ў памяшканьні кіраўніцтва упаўн. НКППрома (Дом Ураду, 5 паверх) 1 лютага а 12 гадз. дню, на якое павінны зьявіцца прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый.

Даведкі атрымліваць у кір. уп. НКЦП у тав. Гольдбэрга.

Бюро цэн кір. упаўн. НКЦП СССР пры СНК БССР

АББЯВЕСТКА

МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА ФІНАНСАВАГА АДДЗЕЛУ

1-га студзеня 1933 году

У мэтах больш дакладнага ўліку зямельных вучасткаў для абкладаньня зямельнай рэнтай на 1933 г., усе юрыдычныя і фізычныя асобы (апрача жакіраў), якія знаходзяцца ў Менску і ў непасрэдным карыстаньні якіх або ўладаньні знаходзяцца зямельныя часткі і пабудовы, павінны падаць у канцылярыю Гарфінаддзелу весткі аб зьменах, зробленых у складзе ямельных вучастка ў або пабудоў супроць тых заяў, якія былі паданы пры агульнай рэгістрацыі зямлі або ў мінулым годзе. Асобы, установы і арганізацыі, якія па якіх-небудзь прычынах зусім не зарэгістравалі сваіх земляў і пабудоў у Гарфа абавязаны падаць весткі на ўстаноўленай форме з прадстаўленьнем дакумантаў на права ўладаньня або плану зямельных вучасткаў.

Фізычныя і юрыдычныя асобы, якія рэгістравалі свае зямельныя вучасткі і пабудовы, у якіх па было ніякіх змен супроць даных мінулага году, ад падачы вестак у гэтым годзе аслабаняюцца.

2. Аб ільготах па зямельнай рэнце.

Для больш поўнага і своечасовага прадстаўленьня ільгот па зямельнай рэнце ваеннаслужачым РСЧА і Ф. і іх сем'ям, рабочым і служачым, утрымацам Сабесу і Страхкасы, у карыстаньні якіх знаходзяцца зямельныя вучасткі і пабудовы, зацікаўленыя асобы павінны падаць у канцылярыю Гарфінаддзелу з явы на ўстаноўленай форме з прадстаўленьнем дакумантаў для пацьверджаньня сваіх правоў на ільготы.

ТЭРМІН ПАДАЧЫ ЗАЯЎ

па ўліку зямлі у складзе зямельных вучасткаў і па зямельнай рэнце

20-га лютага 1933 г.

Блянкі заяў можна атрымаць у Гарфінаддзеле

МЕНГАРФА

КІРАЎНІЦТВА

Днепр-Дзьвінскага рачнога транспарту

даводзіць да вядома ўсіх гаспадарчых арганізацый,

што згодна з пастановай СПА і ЦКК НК-РСІ БССР

з 15 студзеня г. г.

прыступлена да заключэньня ўмоў

на перавозцы грузаў на навігацыю 1933 г.

Умовы на перавозкі будуць заключацца мясцовага раённага характару па Заходняй Дзьвіне Віцебскім райкіраўніцтвам, па Бярэзіне—Бабруйскім райкіраўніцтвам, і умовы рэспубліканскага характару, а таксама па Гомельскім і Магілеускім вучастках кіраўніцтвам Дняпра-Дзьвінскага рачнога транспарту (вул. Арцема № 17, г. Гомель).

Пры заключэньні ўмоў павінна быць прадчэўлены апаведны адказны навігацыйны плян перавозак па месяцах.

АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ ЗАКЛЮЧАЦЬ УМОЎ, ня будуць унесены ў плян перавозак

КІРАЎНІЦТВА ДДРТ

Беларускае аддзяленьне „САЮЗЗАКУПГАНДЛЬ“ не ліквідуецца

З 8 студзеня аднавіла работу па дацзагатоўках і закупках

Зробленую аб'яву ў газ. «Савецкая Беларусь» за 4, 5 і 6-I 1933 г. лічыць адменеай

Дырэктар Бел. аддзяленьня «Саюззакупгандль» РАШКЕС

Рабочыя калектывы, у тановы, жакты і астатнія, хто жадае атрымаць вольны вучастак зямлі пад пасеў, павінны да 15-II 1933 г. падаць заяву ў Менкамгас

(Арэндному аддзелу)

з вказаньнем вучастку, на які яны пратэндуюць для разгледжаньня і рашэньня.

Пасьля ва азначанага тэрміну ніякія заявы па адводзе вуч. зямлі пад засеў прымацца ня будуць

Загадчык арэндна-зямельн. часткі Камгасу Кантаровіч.

ІНСТЫТУТ УДАСКАНАЛЕНЬНЯ МЭДКАДРАЎ абвяшчае прыём у 1933 г. інтэрнаў па наступных спэцыяльнасьцях:

тэрапія, хірургія, акушэр-гінекалёгія, санітарыя і эпідэміялёгія, ахматклад, артаведыя і траўматалёгія, афтальмалёгія, сторыцыдрыгалёгія, наўралёгія і фізыятрыя, псыхіятрыя, сухоты, вэнэрабоды.

Тэрмін інтэрнатуры ад 1 да 1 з пал. г.

Падача заяў з адпаведнымі дакумантамі да 1 лютага г. г. (Менск, НКЗ Інстытут удасканаленьня мэдкадраў)

У лік дакумантаў уваходзяць: жыцьцяпіс, засьведчаны саюзам, рэкамендацыя гарфінаддзелу і згода РВК на аслабаненьне ад работы.

Дырэкцыя інстытуту.

ЗГУБЛЕНЫ

Вайсковы білет, выд. Менскім ваенкаматам на імя Кірыкава А. Т., квіт № 1396.

Членскі білет, выд. саюзам будаўнікоў на імя Лобана В. А., кв. 1063.

Білет на права палявання, выд. Вузьдзенскім райтаварыствам на імя Балабоцкага С. Д., кв. 863

Паведчаньне аб скончэньні Менскай аўташколы на імя Вайткевіча П. А., кв. 864.

Пасьведчаньне асобы, выд. аўтадарожн. тэхнікум. на імя Валодзька І. К., кв. 865.

Пашпарт, выд. Старасельскім сельсаветам на імя Атраш Г. П., кв. 866.

Пашпарт, выд. Сібірскай воблаўпраўленьнем на імя Абрамовіча Д. Б., кв. 867.

Асабовае пасьв., выд. МБВ чыг. пра МШУ на імя Шэрамад І. С., кв 868

Асабовае пасьведчаньне, выд Серпухаўскай міліцыі на імя Боізя В. Ф., кв. 869

Пасьведчаньне, выдан. транспартна-эканом. тэхнікумам на імя Сурупкага А. Л., кв. 870.

Пашпарт, выд. Барысаўскім сельсаветам на імя Цэхановіч С. Б., кв. 871.

Пасьведчаньне на права нашэньня зброі, выд. Валадзінскім ДПК на імя Сільчэнко І. Б., кв. 872.

Асабовае пасьведчаньне, выд. Архангельскім заводам № 5.6 на імя Доўнора А. К., кв. 873.

Матрычны выпіс, выд Менскім загсам на імя Розенкранца І. Г., кв. 645

Матрычны выпіс, выд. Койданскім загсам на імя Яновіч В. І., кв. 646.

Матрычны выпіс выд. Пухавіцкім раёнам на імя Руда віч М. Д., кв. 647.

Вайсковы білет на імя Мавько Ф. З., кв. 1196.

Вайсковы білет, выд. Менскім ваенкаматам на імя Гладко Я. М., кв. 1197

Вайсковы білет, выд. Кіеўскім ваенкаматам на імя Бабіча А. І., кв. 1198

Вайсковы білет, выд Заслаўскім ваенкам на імя Петранка В. С., кв. 1199.

Вайсковы білет, выд. Менскім ваенкамат. на імя Ровяко В. М., кв. 1200.

Членскі білет саюзу гарбароў на імя Ляпёшкіна Я. А., кв 780.

Матрычны выпіс, выд. Менскім загсам на імя Сястрановаў В., кв. 1781

Партбілет выд. Менгаркомам за № 0814[illegible]0 на імя Мільхмана П. У., квіт № 1782.

Вайсковы білет на імя Зеляк А. А., кв. 1783.

Комсамольскі білет за № 721[illegible]5 на імя Росьлік С. А., кв 1784

Членскі білет за № 5895 на імя Краўчанка М. А., кв. 1785.

Даведка, выд. сельсаветам Калантайчык, квіт № 1786.

Членскі білет саюзу сельгаспрацоўнікаў на імя Малейнак А. М. кв. 1787.

Членскі білет на імя Нахмановіч Е. Г., кв. 1788

Членскі білет саюзу будаўнікоў, на імя Жук В.М., квіт 1789.

Членскі білет саюзу будаўнікоў за № 016 [7031 на імя Жалезьнякоў, квіт

Пасьведчаньне, выданае фабрыкай «Камунарка» на імя Баран Е. А., кв. 1792

Членскі білет, выд саюзам мэдсанпрацы, на імя Кісялеўскі А. О., кв. 1793

Вайсковы білет, выданы Пухавіцкім РВК на імя Рунец Е. С., кв. 1794.

Вайсковы білет. выд. Сахкавалавцкім РВК на імя Крэсік І. І., кв. 1795